Сосна, У.А. Палітычная гісторыя познафеадальнай Беларусі ў працах выкладчыкаў кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ: традыцыя і сучаснасць. // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. Вып. 7. – Минск: РИВШ, 2014. С. 231–244.

**Сосна У.А.**

# Палітычная гісторыя познафеадальнай Беларусі ў працах выкладчыкаў кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ: традыцыя і сучаснасць

Познафеадальны перыяд на беларускіх землях, а да яго можна ўмоўна аднесці XVII, XVIII і першую палову XIX стст., быў надзвычай насычаны палітычнымі падзеямі. Гэта войны, канфедэрацыі, шляхецкія паўстанні, рэлігійная барацьба, рэфармаванне дзяржаўнага ладу і гаспадаркі, змена дзяржаўнай прыналежнасці і г.д. Аднак даследаваць часы Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі беларускім савецкім гісторыкам дазвалялася пераважна ў сацыяльна-эканамічным плане, без закранання дзяржаўна-палітычных аспектаў, прычым і перыяд патрабавалася называць па прыналежнасці да адпаведнай грамадска-эканамічнай фармацыі – феадальным. Паводле Карла Маркса, “людзі маюць гісторыю таму, што яны павінны выраблять…” [1, с 29, заўвага], а пры феадалізме асноўнымі вытворцамі матэрыяльных каштоўнасцей былі сяляне і рамеснікі. Значыць, гісторыя феадалізму – гэта перш за ўсё гісторыя ніжэйшых станаў грамадства і іх вывучэнне для савецкіх гісторыкаў мела першаступеннае значэнне. Хоць ва ўмовах партыйнага кіравання гуманітарнымі навукамі нават гэтыя прыярытэты не забяспечвалі ні паўнаты, ні аб’ектыўнасці іх даследавання.

Пры ўсёй “дазволенасці” сацыяльна-эканамічнай праблематыкі, “у савецкі час і ў падручніках, і ў навуковых працах беларускае сялянства падавалася як нікчэмнае і забітае, якое падвяргалася бязлітаснай эксплуатацыі, і ў ежу якога штогод быццам бы дабаўлялася ўсё больш і больш мякіны і яловай кары ці іншых сурагатаў” [2, с.39]. Куды тут было беларусам, а менавіта сацыяльныя нізы толькі імі і прызнаваліся, да ўдзелу ў

палітычным жыцці. Затое так званая класавая барацьба нібыта набывала шырокі размах, бо “некаторыя гісторыкі ў адпаведнасці з ідэалагічнай кан’юнктурай імкнуліся літаральна кожнае зафіксаванае ў крыніцах выступленне сялян, працоўных горада, ледзьве не бойку прызнаць антыфеадальнымі і надаць статус “паўстання”, “выступлення” і г.д.” [3, с.62]

Панаванне сацыяльна-эканамічнага падыходу пры разглядзе феадальнай эпохі савецкімі гісторыкамі бачна і з тагачасных нешматлікіх гістарыяграфічных прац [гл.: 4,5]. І гэта падавалася як дасягненне. Толькі ў часы перабудовы з’явіліся крытычныя ацэнкі стану гістарычнай навукі ў БССР. У прынцыпе можна згадзіцца з канстатацыяй “таго, што гісторыкі Інстытута гісторыі АН БССР і кафедры гісторыі БССР Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта вывучаюць галоўным чынам сацыяльна-эканамічную гісторыю. Вывучэнне гісторыі культуры Беларусі адведзена літаратуразнаўцам, філосафам, мастацтвазнаўцам, фалькларыстам, этнографам. Пры гэтым з поля зроку нашых гісторыкаў выпадаюць палітычная гісторыя, ваенная гісторыя, гісторыя права і г.д. … Імкненне ўцячы ад вывучэння палітычнай гісторыі прывяло да таго, што на гэтым накірунку нашы гісторыкі адсталі ад сваіх калег у суседніх брацкіх рэспубліках і ў Польшчы” [6, с. 19].

І ўсё ж на створанай у 1958 г. ва ўніверсітэце кафедры гісторыі БССР склалася традыцыя вывучэння асобных аспектаў палітычнага жыцця нашых продкаў, нават пры феадалізме. Гэтую традыцыю запачаткаваў яе першы і шматгадовы загадчык Лаўрэнцій Сямёнавіч Абэцэдарскі, увогуле схільны да палітызацыі палітычных падзей (“у кожнае сваё даследаванне ўносіў партыйны дух” [7, с. 89]). Ён востра палемізаваў з беларускімі замежнымі гісторыкамі [гл.: 8], “падвяргаў крытыцы і працы асобных даследчыкаў, якія падыходзілі да асвятлення гісторыі БССР з пазіцый пазакласавага аб’ектывізму” [7, с. 89], за што пазней ганьбаваўся ў публіцыстыцы перабудовачных часоў. Прычым, практычна аднаму Л.С.Абэцэдарскаму, ці

найперш яму сталі прыпісвацца ўсе заганы савецкай гістарыяграфіі Беларусі, без уліку яго рэальнага ўкладу ў навуку.

Навуковыя зацікаўленні Л.С.Абэцэдарскага сягалі да другой паловы XVI-XVII стагоддзяў, у якіх ён вывучаў руска-беларускія адносіны, антыфеадальную барацьбу народных мас і асабліва паўстанні ў сярэдзіне XVII ст., падзеі вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг., казацкія рухі і звязаныя з імі іншыя пытанні сацыяльна-палітычнага жыцця тых часоў. Гэтаму былі прысвечаны асноўныя манаграфічныя працы [9;10], а таксама падрыхтаваны пад яго кіраўніцтвам зборнік дакументаў аб руска-беларускіх сувязях 1570-1667 гг. [11]. Найбольш важкім укладам Л.С.Абэцэдарскага ў гістарычную навуку сучаснымі даследчыкамі прызнаецца кніга «Белорусы в Москве XVII в.» (Мінск, 1957), у якой пададзены звесткі аб іх пасяленнях у Маскве і Замаскоўным краі і выдатнай ролі ў развіцці культуры Маскоўскай дзяржавы. Такая, хоць у многім і палітычная праблематыка ў адпаведнай трактоўцы ўпісвалася ў курс Камуністычнай партыі на ўсямернае збліжэнне і зліццё народаў Савецкага Саюза і таму афіцыйна віталася. Дастаткова ўзгадаць Тэзісы Цэнтральнага камітэта КПСС да 300-годдзя ўз'яднання Украіны з Расіяй 1954 г. – адзіны такога роду дакумент, прысвечаны дабальшавіцкай гісторыі. Праўда, "дазволенасць" тэмы зусім не азначала поўнай творчай свабоды аўтара ў яе асвятленні. "Нязручныя" факты, накшталт масавага прымусовага вываду падчас вайны насельніцтва беларускіх зямель у Расію, належала замоўчваць ці прыходзілася падаваць завуаліравана. Такімі былі ўмовы працы савецкіх гісторыкаў і невыкананне іх пагражала рэрэсіямі і пазбаўленнем магчымасці прафесійнай дзейнасці. Таму гістарыёграфам варта не столькі крытыкаваць, колькі высвятляць, што змаглі зрабіць навукоўцы-гуманітарыі ў той няпросты час.

Калі асоба Л.С.Абэцэдарскага, шквал крытыкі якога паступова змяняецца больш узважанымі ацэнкамі [гл.: 3; 12, с. 68], даволі шырока вядома грамадскасці, то навуковая дзейнасць іншых выкладчыкаў кафедры, і асабліва ў галіне палітычнай гісторыі, чакае свайго асвятлення.

Пытанні беларуска-рускіх сувязей і грамадска-палітычнай барацьбы на беларускіх землях у другой палове XVII – XVIII стст. склалі сутнасць і змест манаграфіі [13] Аляксандра Пятровіча Ігнаценкі і падрыхтаванага ім зборніка дакументаў [14]. У манаграфіі даследчык засяроджваецца перш за ўсё на прадпасылках і прычынах гэтых з'яў: стане сельскай гаспадаркі і гарадской эканомікі, сялянскіх павіннасцях, становішчы сялян і гараджан, нацыянальна-рэлігійных супярэчнасцях. Разгляд тэмы паказаў, што Рэч Паспалітая ў цэлым і Беларусь як яе складовая частка ў гэты час перажывалі эканамічны заняпад і глыбокі палітычны крызіс. Нізкае паводле тэхнічнага ўзроўню земляробства, падарваныя ваеннымі спусташэннямі гарадское рамяство, унутраны і знешні гандаль – усё гэта прывяло да таго, што калісьці ўрадлівыя землі зарасталі хмызняком, а гарады, мястэчкі і вёскі пусцелі. Праўда, як сцвердзілі найноўшыя даследаванні, такая рэзкая ацэнка эканамічнай сітуацыі характэрна для перыяду да сярэдзіны XVIII ст., пасля чаго пачаўся працэс паступовага гаспадарчага аднаўлення і ажыўлення. Прычым, дзеля выхаду з крызісу рабіліся сур'ёзныя спробы рэфармавання эканомікі і дзяржаўнага ладу.

Асноўная ўвага нададзена фактам сацыяльна-класавай і нацыянальна-рэлігійнай барацьбы, прычым яны разглядаюццца праз прызму адносін несельніцтва Беларусі да Расіі. У рамках такога падыходу разгледжаны ўцёкі сялян і гараджан у межы Расійскай дзяржавы і ва Украіну, напады сялян на феадальныя маёнткі, іх разбурэнні і падпалы, пакаранні аканомаў. Прасочваюцца сувязі беларускіх сялян з казацкімі атрадамі і сялянамі суседніх рускіх зямель, водгукі ў Беларусі на гайдамацкае паўстанне і "Калііўшчыну", паўстанне пад кіраўніцтвам Сцяпана Разіна. Вялікую цікавасць уяўляюць апісанні буйных узброеных выступленняў сялян і гараджан у XVIII ст., перш за ўсё падзеяў у Крычаўскім старостве. Усё гэта зроблена на аснове разнастайнай базы крыніц, якая дазволіла істотна пашырыць нашы ўяўленні аб сацыяльна-палітычных працэсах у познафеадальным беларускім грамадстве.

Адметным з’яўляецца паказ палітычнай сітуацыі на беларускіх землях падчас паўстання 1794 г., бо яно лічылася з’явай польскай гісторыі і ў Беларусі не даследавалася. Прызнаючы, што паўстанне было падрыхтавана прагрэсіўнымі шляхецка-буржуазнымі коламі дзеля захавання самастойнасці Рэчы Паспалітай і правядзення ў жыццё рэформ, абвешчаных Чатырохгадовым соймам 1788–1792 гг., А.П. Ігнаценка заўважае неадназначныя адносіны да яго насельніцтва Беларусі і асабліва сялянства, ад пазіцыі якога ў рашаючай ступені залежаў поспех паўстання. Выдадзены Касцюшкам 7 мая Паланецкі універсал абяцаў ім асабістую свабоду і некаторае змяншэнне феадальных павіннасцяў, аднак у рэальнасці застаўся на паперы. Асноўная масы шляхты і тым больш землеўладальнікі не былі гатовы да кардынальных крокаў у сялянскім пытанні. У сувязі з гэтым, лічыў даследчык, удзел беларускіх сялян у паўстанні абмежаваўся пераважна прымусовай іх мабілізацыяй. Пры першай магчымасці, асабліва з набліжэннем расійскіх войскаў, яны беглі дадому. Прыводзяцца факты колькаснага прадстаўніцтва сялян у паўстанцкіх атрадах, заляцанняў да іх як шляхецкага кіраўніцтва, так і царскіх генералаў, якія, у сваю чаргу, імкнуліся выкарыстаць сялян у антыпаўстанцкіх мэтах. У шэрагу месц сяляне, скарыстаўшыся адміністрацыйнай неразбярыхай, ухіліліся ад выканання павіннасцяў і нават грамілі панскія маёнткі. Паказваюцца паводзіны і той часткі сацыяльных нізоў, якія надзеі на паляпшэнне свайго становішча звязвалі са зменай дзяржаўнай прыналежнасці, выяўляючы наіўныя спадзяванні на царызм. Дзякуючы раскрыццю гэтых сюжэтаў, у гістарыяграфіі ўпершыню прагучаў беларускі кантэкст паўстання Тадэвуша Касцюшкі, так актыўна раскрываемы зараз гісторыкамі.

Жорстка крытыкуючы палітыку кіруючых колаў Рэчы Паспалітай, А.П. Ігнаценка не ідэалізаваў і расійскі царызм, які эксплуатаваў этнічную і рэлігійную блізкасць усходнеславянскіх народаў у сваіх вялікадзяржаўна-імперскіх мэтах. Ён не хаваў фактаў сацыяльнай салідарнасці феадальных вярхоў абедзвюх дзяржаў у падаўленні шырокамаштабных рухаў украінскага

і беларускага сялянства. Прыведзены матэрыял сведчыць, што расійскі ўрад дзейнічаў вельмі асцярожна і ў звычайных (мірных) абставінах ніколі не рашаўся на адкрытае выкарыстанне і тым больш падаграванне тых унутраных канфліктаў, якія маглі б прывесці да змены сацыяльнага ладу Рэчы Паспалітай. Ён абмяжоўваўся ўлікам нацыянальна-рэлігійнага чынніка, мяркуючы, што сама розніца ў веравызнанні землеўладальнікаў і іх падданых ва ўсходніх рэгіёнах Рэчы Паспалітай забяспечыць пры неабходнасці падтрымку ўкраінскага і беларускага сялянства.

Такім чынам, А.П. Ігнаценка звязаў сацыяльна-класавую барацьбу на беларускіх землях з палітычным жыццём Рэчы Паспалітай, уключаючы і падзелы гэтай краіны суседнімі дзяржавамі. Праз пераважна новыя архіўныя дадзеныя выяўляецца палітычная роля народных нізоў у познафеадальны перыяд, што ўвогуле дае падставы для спецыяльнага вывучэння палітычнай гісторыі сялянства значна раней, чым яно было вызвалена ад прыгоннай няволі.

Безумоўна, пры абагульненні фактаў іншы раз не абыходзілася без катэгарычных высноў і стэрэатыпаў ды характэрных для савецкай гістарыяграфіі сувязяў з бягучай палітыкай.

Аб тым як, даследуючы сацыяльна-эканамічнае жыццё Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст., нельга было абысціся без уплываючых на гэтае жыццё палітычных чыннікаў, сведчаць кнігі аб сельскай гаспадарцы [15] і сялянскім руху [16] В.У.Чапко. Больш таго, яна, удзельнічаючы ў падрыхтоўцы дакументальнага збору “Белоруссия в эпоху феадализма”, запланаванага першапачаткова ў трох тамах, разам з дацэнтам кафедры гісторыіі СССР БДУ В.У. Шацілам склала яшчэ і чацвёрты том, прысвечаны сацыяльна-палітычнай гісторыі першай паловы XIX ст. [17].

Найперш Валянціна Уладзіміраўна звярнула ўвагу на аграрную палітыку царскіх улад. Слушна заўважыўшы, што палітычныя перамены апошніх двух дзесяцігоддзяў XVIII ст. не прывялі да істотных змен у сацыяльным становішчы сялянства, бо як Рэч Паспалітая, так і Расійская

імперыя былі феадальна-прыгонніцкімі краінамі, яна характарызавала дзеянні Кацярыны ІІ Паўла І наступным чынам: “Аграрная палітыка царскага ўрада ў Беларусі заключалася ў насаджэнні землеўладання рускага дваранства і пашырэнні памешчыцкага землеўладання наогул” [16, с.5, 23]. Сярод прычын аграрных рэформ 1840-х – сярэдзіны 1850-х гадоў прызнана небяспека для ўрада абвастрэння палітычнай сітуацыі ў сувязі з магчымасцю зліцця сялянскіх хваляванняў са шляхецкім вызваленчым рухам [15, с. 166, 175]. “Спробы ўрада ўрэгуляваць сялянскія павіннасці (правядзенне інвентарнай рэформы), як паказана аўтарам, не далі вынікаў, некалькі палепшыўся стан гаспадаркі дзяржаўных сялян пасля правядзення люстрацыі і пераводу іх на аброчнае становішча” [4, с. 117]. Такая даволі ўзважаная ацэнка царскіх рэформаў дысаніравала з агульнай тэндэнцыяй савецкай гістарыяграфіі даводзіць, паводле Уладзіміра Леніна, “да якой ступені згаджанай выходзіць усякая справа з рук самадзяржаўнага ўрада” [18, с. 430].

Разглядаючы сацыяльна-класавую барацьбу – найважнейшую праблематыку савецкіх гісторыкаў адносна феадальнай эпохі – В.У.Чапко паспрабавала вызначыць яе спецыфіку падчас ваенна-палітычных падзей: французка-расійскай вайны 1812 г.; шляхецкага паўстання 1830-1831 гг.; галіцыйскага паўстання 1846 г. і еўрапейскіх рэвалюцый 1848-1849 гг. Сабраны і абагульнены цікавыя факты паводзін сельскіх жыхароў ва ўмовах палітычных узрушэнняў, асабліва каштоўныя сваёй навізной аб агітацыі сярод сялян прадстаўнікоў разначыннай інтэлегенцыі, калі грамадскі рух дэмакратызаваўся. Аднак нярэдка гэтыя факты падаваліся няпоўна і аднабакова, каб пазбегнуць магчымых антырасійскіх акцэнтаў, чаго не прапусціла б пільная ідэалагічная цэнзура. Паводле тагачасных афіцыйных уяўленняў, на зыходзе феадалізму пазіцыя народных мас Беларусі ў сацыяльным плане мусіла быць антыпрыгонніцкай, а ў палітычным – антырэчыпаспалітаўскай і прарасійскай. Гіпертрафіраваны класавы і імперскі падыходы практычна выключалі магчымасць з’яўлення ў гістарыяграфіі БССР грунтоўных прац па гісторыі дзяржаўнасці, шляхецкага саслоўя,

канфесій. А менавіта ў гэтых сферах найперш акумулявалася палітычнае жыццё познафеадальнага беларускага грамадства.

На мяжы 1980-1990-х гг. спачатку аслабеў, а потым і знік партыйны дыктат над гуманітарнымі навукамі, што выклікала іх сапраўдны рэнесанс. Даследчыцкая думка, пазбаўленая ідэалагічна-цэнзурных путаў, разняволілася. Не стала забароненых тэм і сюжэтаў, што праявілася ў змяненні даследчыцкай праблематыкі кафедр і выкладчыкаў гістарычнага факультэта, пошуках новых дакументаў і матэрыялаў не толькі ў айчынных, але і замежных архівах і бібліятэках, актывізацыі ўдзелу ў рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях, пашырэнні спектру публікацый [гл.: 19, с. 160-203]. Асаблівая ўвага звярталася на палітычную гісторыю Беларусі, гісторыю нацыянальнага руху, дзяржаўнасці, канфесій, этнакультурных працэсаў на беларускіх землях. Навукоўцы адкрыта павярнуліся да “ачалавечвання” гісторыі, шырокага і ўсебаковага разгляду ў ёй усіх без выключэння саслоўных станаў і сацыяльных груп насельніцтва. Найперш гэта датычыла свядома замоўчваемай у савецкі час шляхты – носьбіта палітычнага жыцця феадальнай эпохі на беларускіх землях. Сталася магчымам нават паставіць праблему месца і ролі ў палітычным жыцці сялянства. Пакрыху набірала тэмп “інтэлектуальная гісторыя”, даследаванне якой раней было амаль што пад забаронай, бо савецкія ўлады не маглі сабе дазволіць акцэнтаваць увагу на ролі і месцы элітарнай часткі грамадства нават у навукова-адукацыйнай сферы, не кажучы пра палітычную.

У такой спрыяльнай атмасферы ішла падрыхтоўка да 200-годдзя паўстання 1794 г. на землях былой Рэчы Паспалітай пад кіраўніцтвам нашага знакамітага земляка Тадэвуша Касцюшкі, паўстання, глыбока распрацаванага ў Польшчы, але якому не знайшлося месца нават у пяцітомнай “Гісторыі Беларускай ССР” 1970-х гг. “Беларускі след” у паўстанні вырашыў выявіць Уладзімір Пятровіч Емяльянчык, пакінуўшы сваю ранейшую гісторыка-партыйную праблематыку. У яго манаграфіі [20] асвятляецца абстаноўка 90-х гг. XVIII ст. на Беларусі, якая прывяла да паўстання: гэта сацыяльна-

эканамічны і палітычны стан грамадства Рэчы Паспалітай, спробы яго рэфармавання і выратавання краіны ад гібелі, нахабнае ўмяшанне суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы. Перад чытачом паўстаюць вобразы самаадданых барацьбітоў за захаванне Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага, за “вольнасць, цэласць, незалежнасць” Айчыны. Паказана і здрадніцкая дзейнасць тых, хто ў цяжкі для “дзяржавы абодвух народаў” час прадаваў яе захопнікам. Зоркамі першай велічыні выступаюць асобы кіраўніка наўстання ў Літве і Беларусі Якуба Ясінскага і Тадэвуша Касцюшкі. Апошняму прысвечана спецыяльная кніга аўтара, напісаная разам з прафесарам Язэпам Юхо [21].

Даволі пераканаўча раскрыты падзеі паўстання 1794 г. на беларускіх землях, яго падрыхтоўка, пачатак, распаўсюджванне, маштабы і ход ваенных дзеянняў. Прагледжаны баявы шлях паўстанскіх атрадаў, рэальна ацэнены іх вайсковыя магчымасці, прааналізаваны памылкі ў агульным кіраўніцтве імі і рэальныя шансы ў барацьбе з пераўзыходзячымі сіламі расійскіх войскаў. Характарызуецца роля А.В.Суворава ў беларускай гісторыі, асоба якога была неапраўдана ўзвялічана і рамантызавана савецкай гістарыяграфіяй. Паўстанне падаецца як сапраўды народнае, з удзелам не толькі шляхты, але сялян і мяшчан.

Сялянству на старонках кнігі ўдзяляецца асаблівая ўвага. І гэта не выпадкова, бо барацьба за сялянскія душы набыла шырокі размах. Касцюшка, Ясінскі, іншыя радыкальна настроеныя кіраўнікі былі гатовыя да кардынальнага вырашэння сялянскага пытання, аж да поўнага скасавання прыгонніцтва. Аднак асноўная маса шляхты, і асабліва землеўладальнікі, да гэтага былі яшчэ не падрыхтаваны, што і абумовіла абмежаванасць Паланецкага ўніверсалу і тым больш магчымасці яго рэалізацыі. Царскія ж генералы давалі сялянам дэмагагічныя абяцанні і настройвалі іх супраць паўстанцкай шляхты, што, справядліва адзначыў аўтар, з’явілася адной з прычын абмежаванага ўдзелу сялян ў паўстанні і нейтральна-пасіўнай пазіцыі іх асноўнай масы.

Праз усю манаграфію праходзіць тэма самастойнасці паўстання на літоўска-беларускіх землях, г.зн. максімальная ўвага ўдзяляецца толькі цяпер паднятай па-сапраўднаму ў нашай гістарыяграфіі праблеме “ліцьвінскага сепаратызму”. Як раз у гэтым так званым сепаратызме і высвечваецца месца і роля нашых зямель у паўстанні: што дала б нам перамога – далейшую паланізацыю ці адкрыла б перспектывы самастойнага дзяржаўнага ўладкавання? Перамогі не атрымалася, яле як бачна па матэрыялах кнігі, ліцьвінскі фактар у рознай ступені праяўляўся у дзейнасці розных кіраўнікоў паўстання, што тлумачыцца як ступенню іх агульнай паланізацыі, так і прывязанасцю да роднай зямлі і адданасцю мясцовым традыцыям. Дзяржавы ж, якія анексіравалі тэрыторыю Рэчы Паспалітай і задушылі паўстанне Касцюшкі, руйнавалі дзяржаўнасць, якая стагоддзямі тут складвалася. У.П. Емяльянчык абагульніў вялікую колькасць навуковай літаратуры і апублікаваных матэрыялаў, што датычацца нашай тэрыторыі; зроблена даволі плённая спроба  росшуку дакументаў у мінскім і маскоўскіх архівах. Дарэчы, сучасны перыяд развіцця айчыннай гістарычнай навукі адкрыў практычна неабмежаваны доступ да замежных архівасховішчаў, аб чым маглі толькі марыць савецкія гісторыкі і без чаго немагчыма было паўнавартаснае напісанне палітычнай гісторыі Беларусі часоў Рэчы Паспалітай.

З пачатку 1990-х гг. змяніліся даследчыцкія прыярытэты вядомага “аграрніка” П.А.Лойкі. У акадэмічных “Нарысах гісторыі Беларусі” ён піша ўжо не толькі і не столькі пра сялян, колькі пра палітычныя адносіны ў Вялікім Княстве Літоўскім [22] і палітычнае становішча беларускіх зямель у часы Рэчы Паспалітай [23].Гэтым замацоўвалася тэндэнцыя вяртання нашаму народу ва ўсім аб’ёме яго палітычнай гісторыі, асноўнымі дзеячамі якой тады былі шляхціцы.

Для паглыбленай распрацоўкі гісторыі шляхты Павел Алегавіч абраў перыяд апошняй трацiны XVI- першай трацiны XVII ст., калі ў паслялюблінскіх умовах дробная і сярэдняя шляхта, пацясніўшы магнатэрыю, стала вызначальнай сілай у Княстве. Менавіта тады, да

ўсталявання магнацкай алігархіі, шляхта беларускіх земляў найбольш актыўна і вынікова ўдзельнічала ў вырашэнні складаных унутраных і знешнепалітычных задач. Прычым, калі расійскія даследчыкі абмежавалі вывучэнне шляхты "Літоўска-Рускай дзяржавы" часамі да ўтварэння Рэчы Паспалітай, то польскія асноўную ўвагу ўдзялілі "Кароне", а падзеі ў "Літве" іх цікавілі толькі ў сувязі з польскімі землямі. Да таго ж, стаў лёгка даступным для даследчыкаў з краін СНД Галоўны архіў даўніх актаў у Варшаве, дзе сабраны асноўныя соймавыя дакументы.

Вынікам напружанай працы ў гэтым кірунку стала падрыхтоўка і выхад у 2002 г. манаграфіі аб удзеле шляхты беларускіх земляў у грамадска-палітычным жыцці [24]. У яе першым раздзеле "Стан шляхты беларускіх зямель у далюблінскі перыяд"паказаны працэс фарміравання і юрыдычнага афармлення гэтага саслоўя, што адбылося да сярэдзіны XVI ст. Адзначаны падзел прывілеяванага стану, паводле маёмаснай вагі і доступу да дзяржаўных пасадаў, прынамсі на тры катэгорыі:магнаты-латыфундысты, сярэдняя і дробная шляхта. Даведзена, што такі падзел абумоўліваў як неаднолькавую ступень удзелу катэгорый шляхты ў грамадска-палітычным жыцці дзяржавы, так і адрознасць іх сацыяльна-палітычных інтарэсаў.

Асноўнай часткай манаграфіі стаў другі раздзел "Палітычныя інтарэсы і сацыяльная актыўнасць шляхты беларускіх зямель у апошняй трэці XVI- першай трэці XVII ст." З яе бачна, наколькі шырокім быў абсяг пытанняў, што ставіліся, абмяркоўваліся, вырашаліся на шляхецкіх сходах павятовага, ваяводскага, агульнавялікакняжацкага ўзроўняў. Гэта знешнепалітычныя ўзаемадачыненні, эканамічныя праблемы, удасканаленне судовай сістэмы, арганізацыя вайсковай справы, міжэтнічныя стасункі, кадравыя прызначэнні, канфесійныя канфлікты і шмат іншых. Палітычная актыўнасць "народу шляхецкага" была найвышэйшай. Інструкцыі паслам паветаў на вальны сойм не былі для цэнтральнай улады пустой паперай, а шляхціцы адчувалі сябе выпрацоўшчыкамі палітычнага курсу краіны. Палітычная эліта ВКЛ у першыя дзесяцігоддзі пасля Люблінскай уніі старалася, наколькі магчыма,

дыстанцыявацца ад заходняга партнёра і вытрымліваць лінію на самастойнае бачанне і вырашэнне ўнутры- і знешнепалітычных праблем, хоць паступова адбывалася прыцірка і збліжэнне інтарэсаў “абодвух народаў” Рэчы Паспалітай.

Цікавейшым з’яўляецца завяршальны раздзел аб грамадска-палітычнай свядомасці нашай шляхты. Найперш, якім было для іх паняцце Айчына. Як высвятляецца, напачатку даследуемага перыяду гэта толькі Вялікае Княства Літоўскае, а напрыканцы-ужо і Рэч Паспалітая (“Рэч Паспалітая наша, Карона і Літва”). Шляхта лічыла сябе ствaральнікам асноў дзяржавы, гарантам яе моцы і функцыянавання. Ідэалам унутрыдзяржаўнага становішча краіны ўяўляецца хатні мір і жыццё ў “міласці і згодзе”.Дыктатура права павінна была гарантаваць вольнасці і роўнасць шляхецкага асяроддзя, да каштоўнасцей якога адносіліся грамадзянская адказнасць, справядлівасць, адданасць справе, адкрытасць, абмежаванасць у патрэбах, салідарнасць, мужнасць, абарончая ваяўнічасць, асабістая годнасць. Такі вобраз шляхціца відавочна не стасуецца з аднабаковай выявай яго ў савецкай гістарыяграфіі як этнічнага чужынца і эксплуататара – крывапіўца сялянскіх мас.

Адкрытая П.А.Лойкам даследчыцкая праблематыка патрабуе далейшай паглыбленай распрацоўкі і развіцця, што паспяхова ажыццяўляюць яго вучні.

Аўтар артыкула таксама пачынаў навуковую дзейнасць у савецкі час з “дазволенай” сацыяльна-дэмаграфічнай тэмы саслоўна-групавога складу сялянства, аднак у ходзе даследавання высветлілася, што гэты склад у вырашальнай ступені залежыў ад палітычных фактараў, аб чым сігналізуюць нават назвы глаў выдадзенай пазней манаграфіі: “Канфіскацыі памешчыцкіх маёнткаў”; “Раздачы і папаўненні дзяржаўнай вёскі”; “Секулярызацыя царкоўных уладанняў”; “Нівеліроўка спецыяльных катэгорый сельскага насельніцтва” [25]. Таму манаграфія набыла не толькі гісторыка-дэмаграфічны, але і выразна гісторыка-палітычны характар, бо па сутнасці сваёй раскрывае адносіны царскіх улад да ўсяго разнастайнага складу сялянства Беларусі і ўплыў на яго палітычных падзей.

Далейшае паглыбленне аўтара ў палітычную гісторыю з сялянскага ракурсу прывяло да агульнай высновы, што нягледзячы на крайнюю абмежаванасць рамкамі феадальнага ладу, у перыяд з канца XVIII да сярэдзіны XIX ст. палітычнае жыццё ў вёсцы несумненна мела месца, яно закранала не толькі эканамічную, але і саслоўную, рэлігійную, этнакультурную сферы, аж да барацьбы за дзяржаўную прыналежнасць і сацыяльную будучыню беларускіх зямель. Сяляне з’яўляліся самым шматлікім і найбольш прыгнечаным класам познафеадальнага беларускага грамадства. З-за неадукаванасці большасць з іх не валодала палітычнай свядомасцю і не праяўляла ў гэтым плане актыўнасці. Аднак на сялян прама ці ўскосна ўздзейнічалі розныя грамадскія сілы, што “гулялі” на палітычным полі, аж да іх, хоць часовага, уцягнення туды. Прычым так званы заходні край, як ніякі іншы ў Расійскай імперыі, выдзяляўся насычанасцю палітычных падзей, зыход якіх у многім залежаў ад удзелу і паводзінаў сялянства. Увогуле, палітычнае жыццё вёскі тут было больш разнастайным, чым у цэнтральных губернях, узрастала на працягу акрэсленага храналагічнага перыяду і больш інтэнсіўна праяўлялася ў заходнім рэгіёне. Відавочна, палітычнае прабуджэнне мас садзейнічала агульнаму разняволенню і падрывала асновы феадальнага грамадства. А агульнае аслабленне феадальна-прыгонніцкай сістэмы на стадыі яго разлажэння стварала прадпасылкі для палітычнай актывізацыі сялянства. Таму пачатак палітызацыі жыцця сялян адпавядае сутнасці гэтага пераходнага да капіталізму, з яго грамадзянскай свабодай і юрыдычнай роўнасцю станаў, перыяду [падрабязней гл.: 26].

Новае пакаленне выкладчыкаў кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, што выдзелілася ў 1994 г. з агульнай кафедры гісторыі БССР – Беларусі, ужо не мела савецкага гістарыяграфічнага досведу і змагло свабодна, зыходзячы толькі з навуковых падставаў, абіраць тэматыку сваіх даследаванняў. І палітычная гісторыя

разглядаемага намі перыяду аказалася запатрабаванай, прычым у тых яе аспектах, якія раней гісторыкам БССР былі недаступнымі.

Алена Рыгораўна Дзянісава звярнулася да доўга замоўчваемай канфесійнай праблематыкі. У яе дысертацыі [27] упершыню комплексна разгледжана дзейнасць, у тым ліку ў грамадска-палітычнай сферы, праваслаўных манастыроў Турава-Пінскай епархіі да XVII ст. уключна. Аналіз і сістэматызацыя апублікаваных і архіўных крыніц, разам з абагульненнем дасягненняў дасавецкай гістарыяграфіі дазволілі вылучыць асаблівасці станаўлення і арганізацыі манаскага жыцця, рэканструяваць і даследаваць кірункі дзейнасці праваслаўных манастыроў епархіі, вызначыць іх ролю і значэнне ў тагачасных грамадскіх працэсах. Прычым асабліва яскрава выступае сувязь і залежнасць манастырскага жыцця ад унутранай і знешняй палітыкі кіруючых колаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Алена Васільеўна Дземідовіч выйшла на абсягі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага, аб чым нават не смелі марыць гісторыкі савецкай Беларусі. Яна прысвяціла сваё дысертацыйнае даследаванне [28] вызначэнню месца і ролі ВКЛ у сістэме ўзаемадачыненняў Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай траціне XVII ст. Упершыню на аснове шырокага кола крыніц і літаратуры ацэнены пазіцыя і ўплыў Княства ў гэтых стасунках, паказана дынаміка стаўлення шляхты да ўвасаблення знешняй палітыкі ў жыццё, вызначаны асноўныя матывы, якія абумоўлівалі пэўную пазіцыю вышэйшага саслоўя ВКЛ. Як высвятляецца, магнаты і шляхта беларускіх зямель адыгрывалі важную ролю ў фарміраванні і рэалізацыі знешнепалітычнага курсу краіны, што падкрэслівае нашу суб’ектнасць у гісторыі.

У позні феадалізм “заглядаюць” і даследчыкі сумежных перыядаў. Так, сёлета убачыла свет калектыўная манаграфія, у якой былі адлюстраваны розныя бакі гісторыі шляхецкага роду Валовічаў за перыяд XV–XVIII стст. Аўтарам аднаго з раздзелаў, прысвечаных удзелу дадзенага роду ў

палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага другой паловы XVI–першай траціны XVII ст., з'яўляецца Уладзімір Аляксеевіч Падалінскі. Менавіта ў гэты час Валовічы занялі трывалыя і ўплывовыя пазіцыі ў палітычным народзе ВКЛ. У раздзеле прасочаны роля і актыўнасць прадстаўнікоў розных галінаў роду Валовічаў на лакальным і агульнадзяржаўным узроўнях палітычнага жыцця ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Аўтарам былі вызначаны рэгіёны грамадскай дзейнасці і шляхі кар'ернага росту прадстаўнікоў роду Валовічаў, іх маёмаснае становішча, кліентальныя і сваяцкія сувязі, змены ў канфесійнай прыналежнасці [29].

У.А. Падалінскі даследуе таксама рэгіянальныя палітычныя эліты Вялікага Княства. У прыватнасці, ім быў праведзены аналіз персанальнага складу земскага суда Гарадзенскага павета канца XVI – пачатку XVII ст. Былі разгледжаны сацыяльны і маёмасны статус членаў гарадзенскага земскага суда, іх канфесійная прыналежнасць і этнічнае паходжанне, шляхі кар'еры і грамадска-палітычная дзейнасць. Акрэслены галоўныя кірункі далейшых даследаванняў гарадзенскіх судовых ураднікаў [30].

За "непапулярную" у познасавецкія часы гісторыю беларускіх яўрэяў узялася Юлія Валер'еўна Функ. Хоць асноўная ўвага была ўдзелена сацыяльнаму складу і эканамічнаму становішчу яўрэйскага насельніцтва на мяжы XIX-XX стст. [31], аднак даследчыца звярнула ўвагу і на некаторыя палітычныя пытанні папярэдняга перыяду. Напрыклад, быў праведзены аналіз узаемадачыненняў органаў мясцовага самакіравання з кагаламі на тэрыторыі беларускіх губерняў, іх правоў і абавязкаў адносна выплаты падаткаў, удзелу ў грамадскім жыцці. Зараз Ю.В.Функ цікавіцца сацыяльна-палітычным становішчам яўрэйскага насельніцтва ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай XVI-XVII стст.

І такія прыклады можна доўжыць, асабліва калі звярнуцца да даследчыцкай праблематыкі магістрантаў, аспірантаў і суіскальнікаў кафедры.

Такім чынам, на кафедрах гісторыі БССР, гісторыі Беларусі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта яшчэ ў неспрыяльных для навукоўцаў-гуманітарыяў савецкіх умовах была закладзена, а ў часы незалежнасці трывала ўсталявалася традыцыя даследавання палітычнай гісторыі познафеадальнага перыяду. Прычым, у артыкуле разгледжаны толькі манаграфічныя і дысертацыйныя працы выкладчыкаў старэйшага, сярэдняга і малодшага пакаленняў. Зараз іх вучні і паслядоўнікі ў сваіх шматлікіх артыкулах і выступленнях на навуковых канферэнцыях плённа развіваюць і паглыбляюць гэтую традыцыю.

**Спіс літаратуры:**


1. Маркс, К. Немецкая идеология/К.Маркс и Ф.Энгельс // Маркс, К. Сочинения. 2-е изд. Т.3/К.Маркс и Ф.Энгельс. – М.: Госполитиздат, 1955. – С. 7-544.
2. Голубеў, В. Памяці сябра, Паўла Алегавіча Лойкі/В.Голубеў//Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. – №9. – С.37-41.
3. Сташкевіч, М. Лаўрэнцій Абэцэдарскі: народжаны стаць гісторыкам/ М.Сташкевіч // Беларуская думка. – 2011. – №7. – С.60-65.
4. Копысский, З.Ю. Историография БССР (эпоха феодализма): Учеб. пособие / З.Ю. Копысский, В.В. Чепко; под ред. Я.Н. Мараша. – Минск.: изд-во «Университетское», 1986. – 175 с.
5. Достижения исторической науки в БССР за 60 лет/Под ред. З.Ю.Копысского, П.Т.Петрикова. – Минск: Наука и техника, 1979. – 80 с.
6. Грыцкевіч, А. Няўжо “забароненая зона”?/ А.Грыцкевіч, В. Грыцкевіч, А.Мальдзіс // З гісторыяй на “Вы”: Публіцыстычныя артыкулы/ Уклад. У.Арлова. – Мінск: Маст.літ., 1991. – С.17-27.
7. Баранава, М. Вучоны і педагог/М.Баранава, Н.Паўлава, В.Маскаленка // Народная асвета. – 1976. – №7. – С. 88-90.
8. Абецадарскі, Л. У святле неабвержных фактаў/Л.Абецадарскі. – Мінск: “Голас Радзімы”, 1969. – 112 с.

9. Абэцэдарскі, Л.С. Барацьба украінскага і беларускага народаў за ўз’еднанне з Расіяй у сярэдзіне XVII века/Л.С.Абэцэдарскі. – Мінск: Дзярж.выд.БССР, 1954. – 67 с.

10. Абецедарский Л.С. Белоруссия и Россия: Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI – XVII в./Л.С.Абецедарский; под ред. З.Ю.Копысского – Минск: “Вышэйшая школа”, 1978. – 254 с.

11. Русско-белорусские связи. Сб. документов (1570-1667 гг.). – Минск: “Высшая школа”, 1963. – 534 с.

12. Гістарычны факультэт. Да 70-годдзя заснавання/адк.рэд. С.М.Ходзін. – Мінск: БДУ, 2004. – 223 с.; іл.

13. Игнатенко, А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией (вторая половина XVII-XVIII в.)/А.П.Игнатенко. – Минск: Изд-во БГУ, 1974. – 192 с.

14. Русско-белорусские связи во второй половине XVII века (1667-1686 гг.). Сб. документов. – Минск: Изд-во БГУ, 1972. - 376 с.

15. Чепко, В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века/В.В.Чепко. – Минск: «Наука и техника», 1966. – 220 с.

16. Чепко, В.В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в./В.В.Чепко. – Минск: «Наука и техника», 1972. – 268 с.

17. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов и материалов. – Минск: Наука и техника, 1979. – Т.4. – 376 с.

18. Ленин, В.И. Рабочая партия и крестьянство/В.И.Ленин // Ленин, В.И. Полное собрание сочинений. 5-е изд. Т.4/В.И.Ленин. – М.: Изд-во политической литературы, 1971. – с.429-437.

19. Бібліяграфічны даведнік навуковых работ супрацоўнікаў гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта (1921-1994 гг.). – Мінск, 1994. – 204 с.

20. Емяльянчык, У. Паланез для касінераў: (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі на Беларусі)/У.Емяльянчык. – Мінск: Беларусь, 1994. – 160 с.

21. Юхо, Я. “Нарадзіўся я ліцьвінам…”: Тадэвуш Касцюшка/Я.Юхо, У.Емяльянчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 68 с.; іл.

22. Лойка, П.А.Палітычныя адносіны ў Вялікім княстве Літоўскім/П.А.Лойка // Нарысы гісторыі Беларусі.У 2-х ч.Ч.1/ Рэдкал.: М.П.Касцюк(гал.рэд.) [і інш.]. - Мінск: Беларусь,1994.-С.114-140.

23. Емяльянчык, У.П. Палітычнае становішча. Канец Рэчы Паспалітай/У.П.Емяльянчык, П.А.Лойка//Тамсама. – С.228-243.

24. Лойка, П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI- першай трэці XVII ст. / П.А.Лойка.-Мінск:БДУ,2002. – 99 с.

25. Сосна, У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст./У.А.Сосна. – Мінск: БДУ, 2000. – 115 с.

26. Сосна, У.А. Палітычная гісторыя сялянства Беларусі канца XVIII-сярэдзіны XIX ст.: вынікі даследавання/У.А.Сосна // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб.науч.ст. Вып. 4(9)/под ред. В.Ф.Беркова. – Минск: РИВШ, 2007. – С.173-179.

27. Дзянісава, А.Р. Праваслаўныя манастыры Турава-Пінскай епархіі ў грамадскім жыцці на беларускіх землях у XI-XVII стст.: аўтарэф.дыс. … канд.гіст.навук: 07.00.02/А.Р.Дзянісава; Беларус. дзярж. ун-т. - Мінск, 2009. – 22 с.

28. Дземідовіч, А.В. Вялікае Княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.: аўтарэф.дыс. … канд.гіст.навук:07.00.15/ А.В.Дземідовіч; Беларус. дзярж. ун-т. - Мінск, 2012. – 22 с.

29. Падалінскі, У. Валовічы ў палітычным жыцці ВКЛ другой паловы XVI – пачатку XVII ст. / У. Падалінскі // Unus pro omnibus: Валовічы ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага XV–XVIII стст. / склад.

А.М. Янушкевіч; навук. рэд. А.І. Шаланда. – Мінск: Медысонт, 2014. – С. 315–332.

30. Падалінскі, У. Да характарыстыкі персанальнага складу гарадзенскага земскага суда ў канцы XVI – пачатку XVII ст. / У. Падалінскі // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2012. – С. 135–147.

31. Функ, Ю.В. Евреи Беларуси в конце XIX – начале XX в./Ю.В.Функ. – Минск: БелНИИДАД, 1998. – 105 с.

РЕЗЮМЕ

Сосно В.А. Политическая история позднефеодальной Беларуси в трудах преподавателей кафедры: традиция и современность.

[2014]

Двадцать лет назад кафедра истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета выделилась с созданной ещё в 1958 г. общей кафедры истории БССР, наследуя и развивая её традицию исследования политической истории XVII, XVIII и первой половины XIX вв. Эта традиция воплотилась в научных трудах старшего (Л.С.Абецедарский, А.П.Игнатенко, В.В.Чепко), среднего (В.П.Емельянчик, П.О.Лойко, В.А.Сосно) и младшего (Е.Г.Денисова, Е.В.Демидович, В.А.Подолинский, Ю.В.Функ) поколений преподавателей кафедр. Сдерживаемая и ограничиваемая в советское время, политическая история феодальной эпохи получила возможность всестороннего, объективного рассмотрения в Республике Беларусь.

Сосно Владимир Аркадьевич – кандидат исторических наук, доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков Белорусского государственного университета.